# ПЛЕНУМ ЦК КПСС

14 чэрвеня 1983 года пачаў работу чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пасяджэнне адкрыў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Ю. У. Андропаў.

З дакладам «Актуальныя пытанні ідэалагічнай, масава-палітычнай работы партыі» на Пленуме выступіў член Палітбюро, сакратар ЦК КПСС тав. К. У. Чарненка.

Затым адбылося абмеркаванне даклада.

* * *

15 чэрвеня 1983 года на Пленуме ЦК КПСС працягвалася абмеркаванне даклада члена Палітбюро ЦК КПСС, сакратара ЦК КПСС тав. К. У. Чарненкі «Актуальныя пытанні ідэалагічнай, масава-палітычнай работы партыі».

З вялікай прамовай на Пленуме ЦК выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Ю. У. Андропаў.

Пленум ЦК КПСС аднагалосна прыняў па абмеркаванаму пытанню пастанову, якая апублікавана ў друку.

Цэнтральны Камітэт КПСС аднадушна адобрыў праграмныя палажэнні і вывады, змешчаныя ў прамове Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Ю. У. Андропава на Пленуме, указаў, што яны павінны быць пакладзены ў аснову ўсёй дзейнасці партыйных арганізацый.

Пленум ЦК КПСС выказаў цвёрдую ўпэўненасць, што ідэалагічныя кадры, усе камуністы аддадуць свае сілы, энергію і веды высакароднай справе камуністычнага выхавання, прадоўжаць і ўзбагацяць слаўныя традыцыі бальшавіцкай прапаганды, даб'юцца новых поспехаў у рэалізацыі гістарычных задач, якія стаяць перад Камуністычнай партыяй і савецкім народам.

Пленум ЦК КПСС разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

Пленум ЦК выбраў члена Палітбюро ЦК КПСС тав. Р. В. Раманава сакратаром ЦК КПСС.

Пленум ЦК зацвердзіў кандыдатам ў члены Палітбюро ЦК КПСС тав. М. С. Саломенцава Старшынёй Камітэта партыйнага кантролю пры ЦК КПСС.

Пленум ЦК выбраў тав. В. І. Варатнікова кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС.

Пленум ЦК перавёў з кандыдатаў у члены ЦК КПСС таварышаў С. Ф. Ахрамеева — першага намесніка начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР, Б. У. Бальманта — міністра станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці, В. І. Качамасава — Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла СССР у ГДР, В. М. Чардзінцава — камбайнера калгаса «Рассвет», Арэнбургская вобласць, В. М. Шабанава — намесніка міністра абароны СССР.

Пленум ЦК вывеў з саставу ЦК КПСС М. А. Шчолакава і С. Ф. Медунова за дапушчаныя памылкі ў рабоце.

На гэтым Пленум ЦК КПСС закончыў работу.

# СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

У абстаноўцы высокага палітычнага ўздыму і дзелавітасці 16 чэрвеня ў Маскве пачала работу восьмая сесія Вярхоўнага Савета СССР дзесятага склікання.

У 10 гадзін раніцы адкрыліся раздзельныя пасяджэнні Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

На пасяджэннях палат аднагалосна зацверджан парадак дня сесіі і парадак яе работы. На абмеркаванне вынесены пытанні:

1. Аб выбранні Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

2. Аб некаторых змяненнях ў саставе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

3. Аб міжнародным становішчы і знешняй палітыцы Савецкага Саюза.

4. Аб праекце Закона СССР аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі.

5. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР

Першае сумеснае пасяджэнне Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей пачалося ў 11 гадзін у Вялікім Крамлёўскім палацы.

Бурнымі, працяглымі апладысментамі дэпутаты і госці сустрэлі таварышаў **Ю. У. Андропава, Г. А. Аліева, М. С. Гарбачова, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, Д. А. Кунаева, Р. В. Раманава, М. А. Ціханава, Д. Ф. Усцінава, К. У. Чарненку, У. В. Шчарбіцкага, В. І. Варатнікова, П. Н. Дзямічава, У. І. Далгіх, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, Ш. Р. Рашыдава, М. С. Саломенцава, Э. А. Шэварднадзе, М. В. Зіманіна, І. В. Капітонава, К. В. Русакова, М. І. Рыжкова.**

Слова прадастаўляецца члену Палітбюро ЦК КПСС, сакратару ЦК КПСС дэпутату **К. У. Чарненку.**

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Саветы Старэйшын Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета, сказаў ён, уносяць на ваш разгляд прапанову аб выбранні Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС таварыша Юрыя Уладзіміравіча Андропава Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Дэпутаты аднагалосна прымаюць пастанову **аб выбранні таварыша Ю. У. Андропава Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.** Гэта рашэнне дэпутаты і госці, якія прысутнічаюць на сесіі, сустракаюць бурнымі, працяглымі апладысментамі.

Затым выступіў Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыш **Юрый Уладзіміравіч Андропаў.** Прысутныя вітаюць яго апладысментамі, стоячы.

Затым дэпутаты пачалі разгляд другога пытання парадку дня Членамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР выбраны дэпутаты **М. М. Слюнькоў, В. М. Мішын.**

З дакладам «Аб міжнародным становішчы і знешняй палітыцы Савецкага Саюза» выступіў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, міністр замежных спраў СССР дэпутат **А. А. Грамыка.**

Учора восьмая сесія Вярхоўнага Савета СССР працягвала сваю работу.

ТАСС.


ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 22 (544) | Субота, 18 чэрвеня 1983 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап






НА ЗДЫМКУ: на «выдатна» здала дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму студэнтка завочнага факультэта спецыяльнасці біялогія Ала Мурашкова.

Дзённік сесіі

# ХУТКА ФІНІШ

Працягвае адлічваць дні летняя экзаменацыйная сесія. Кожны дзень прыносіць яна радасці, а здараецца, і засмучэнні студэнтам універсітэта, выкладчыкам.

...Пануе ажыўленне ў дэканаце эканамічнага факультэта. Праўда, яно не зусім прыемнае як для саміх студэнтаў, якія прыходзяць сюды за накіраваннямі на перездачу экзаменаў, так і для работнікаў дэканата. Што ж, клопаты асобных студэнтаў скіраваліся, як кажуць, не ў тое рэчышча. Замест таго, каб разам са сваімі аднакурснікамі рыхтавацца як след да чарговага экзамена, ім даводзіцца траціць час на тое, каб атрымаць накіраванне на здачу заліка, не вытрыманага тады, калі гэта было неабходна. Вось і атрымліваецца тое замкнутае кола, што прыводзіць у канчатковым выніку да не зусім пасляховага канца — невысокіх адзнак на далейшых экзаменах.

Загублены марна час у семестры цяпер прымушае студэнтаў удвая хутчэй наверстваць упушчанае. А зрабіць гэта бывае пад сілу не кожнаму. Адсюль вынікі, такія як, напрыклад, у другакурснікаў аддзялення эканомікі працы. Пасля двух экзаменаў па палітэканоміі і матэматычнаму праграмаванню ў ведамасцях з'явілася шэсць нездавальняючых адзнак. Тры двойкі і ў першакурснікаў гэтага ж аддзялення. Нямала працэнт здавальняючых адзнак на ўсіх курсах факультэта. Не з лепшага боку вызначыліся студэнты чацвёртага курса аддзялення АМАЭІ П. Кавалёў, М. Крантоўскі і С. Калеснікава, якія атрымалі двойкі па аднаму са здаваемых прадметаў. Такіх прыкладаў можна было б прыводзіць нямала.

Але, каб не склалася вельмі сумнае ўражанне наогул аб пасляховасці будучых эканамістаў у гэту сесію, скажам аб тых, на каго б варта было раўняцца адстаючым, у каго павучыцца, як правільна і рацыянальна планаваць свой час у семестры, як у цэлым адносіцца да заняткаў. З поспехам вытрымалі па аднаму і два экзамены студэнты групы 0-13 Т. Хмялеўская, Н. Сітко, Г. Казмірчук, другакурснікі І. Гулевіч і В. Рувоў, чацвёртакурснікі І. Працко, А. Філіпчанка Т. Безя і інш.

Каб пасяхова дайсці да фінішу сесіі, трэба і ў застаўшыся час не траціць дарэмна ніводнай гадзіны, рыхтавацца да кожнага выпрабавання з усёй адказнасцю і сур'ёзнасцю.

(Наш кар.).

# НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

16 чэрвеня адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта.

Аб ходзе выканання міжвузаўскай комплекснай праграмы па распрацоўцы рэкамендацый па навуковай арганізацыі і павышэнні эфектыўнасці працы прафесарска-выкладчыцкага саставу далажыў дацэнт І. П. Трацэўскі.

Аб выкладанні курса «Уводзіны ў спецыяльнасць» гаварыў у сваім выступленні загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін дацэнт А. І. Кіеня.

Загадчыца вучэбнага аддзела Н. І. Папкова зрабіла паведамленне аб выкананні рашэння калегіі Мінвуза БССР ад 21 студзеня 1983 г. аб запрашэнні вучоных ва універсітэт.

Старшыня прафкома студэнтаў Н. І. Колтышава гаварыла на Савеце аб выкарыстанні працэнта стыпендыяльнага фонду і правільнасці яго расходавання ў бягучым годзе.

На займаемыя і вакантныя пасады выбраны і перавыбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў.

Па конкурсу дэканам эканомфака выбраны прафесар У. Д. Арэшчанка.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра навуковага камунізму горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры КАСЬЯНЕНКУ Анатоля Пятровіча з прысуджэннем яму ВАКам вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук.**

*Справаздачы і выбары ў партарганізацыях*

# КРЫТЫЧНА, ПАТРАБАВАЛЬНА

Адбыўся справаздачна-выбарны партыйны сход матэматычнага факультэта. У справаздачным дакладзе партбюро падкрэслівалася, што ў мінулым годзе камуністы факультэта працягвалі работу па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ у справе ўдасканальвання якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных, ідэйна перакананых, адданых справе Камуністычнай партыі спецыялістаў-матэматыкаў. Значную ролю ў вырашэнні пастаўленых перад факультэтам задач адыгрываюць кадры. На сходзе адзначалася, што на прыкладзе факультэта прасочваецца правільнасць абранага рэктаратам і парткомам універсітэта курса на падрыхтоўку кадраў перш за ўсё з ліку выпускнікоў факультэта і выпускнікоў аспірантуры вядучых універсітэтаў краіны.

Асноўная ўвага ў справаздачным дакладзе і ў выступленнях камуністаў была сканцэнтравана на недахопах. У прыватнасці, гаварылася, што паспяховасць студэнтаў нізкая. На працягу некалькіх гадоў яна вагаецца ў межах ад 88 да 91 працэнта. Параўнальна высокі і працэнт выключаных з універсітэта студэнтаў за непаспяховасць. У чым прычына такога становішча? Перш за ўсё, кафедры праводзяць недастатковую работу па адаптацыі першакурснікаў. Работа са студэнтамі І курса патрабуе большай увагі з боку партыйнага бюро і дэканата. Партбюро факультэта недастаткова ўдзяляе ўвагі і рабоце па стварэнню атмасферы нецярпімасці да гультаёў, прагульшчыкаў. На факультэце праводзіцца шмат карысных мерапрыемстваў, але сярод іх вельмі мала такіх, якія б прапагандавалі любоў да будучай прафесіі, а, значыць, і імкненне да авалодвання ведамі.

Камуністы крытыкавалі партбюро факультэта за слабую работу па прафарыентацыі школьнікаў і, асабліва, па арганізацыі набору на завочны факультэт.

Адной з важнейшых задач, пастаўленых лістападаўскім (1982 г.) Пленумам ЦК КПСС, з'яўляецца задача ўкаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі. Таму на парадак дня аднаго з пасяджэнняў партбюро факультэта было вынесена пытанне «Аб развіцці творчых сувязей з вытворчым аб'яднаннем «Гомсельмаш». З паведамлення загадчыка кафедры МПУ дацэнта І. В. Максімея акрэслілася рэальная перспектыва ўкладу гэтай кафедры ў выкананне пастаноў майскага і лістападаўскага (1982 г.) Пленумаў ЦК КПСС. Глыбокія навуковыя даследаванні вядуцца на кафедрах алгебры і геаметрыі (заг. кафедры — прафесар Л. А. Шамяткоў) і дыферэнцыяльных ураўненняў (заг. — дацэнт У. І. Міроненка).

Найбольш слабым месцам у арганізацыі навукова-даследчай работы на факультэце, як адзначалася на сходзе, з'яўляецца студэнцкая навука. У мэтах яе актывізацыі партыйнае бюро вырашыла ў новым навучальным годзе арганізаваць на факультэце работу студэнцкага канструктарскага бюро.

Палітыка-выхаваўчая, ідэалагічная і арганізацыйная работа, якая праводзілася партыйным бюро ў справаздачным годзе, атрымала ў цэлым станоўчую ацэнку ідэалагічнай камісіі Цэнтральнага РК КПБ г. Гомеля, хаця і ў гэтай галіне ёсць яшчэ істотныя недахопы. Так, укаранёны на факультэце комплексны план палітыка-выхаваўчай работы патрабуе больш дакладнай каардынацыі з кафедрамі, з камсамольскай арганізацыяй факультэта.

Камуністы, якія выступілі ў спрэчках, адзначалі, што адной з асноўных задач партарганізацыі ў справе паляпшэння ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы з'яўляецца павышэнне ролі кафедры. Неабходны таксама ўдзел у гэтай рабоце кожнага выкладчыка. Нельга дапускаць фармалізму пры разглядзе пытанняў па камуністычнаму выхаванню студэнтаў на пасяджэннях кафедр. Больш цеснымі павінны быць сувязі кафедр з камсамольскімі арганізацыямі груп.

Значнае месца ў дакладзе ўдзялялася пытанням праверкі і выканання прынятых рашэнняў, якасці іх падрыхтоўкі, дзейснасці партыйнага рашэння.

У абмеркаванні справаздачнага даклада прынялі ўдзел камуністы Ю. А. Кашын, В. П. Рубанік, А. Р. Грышачкін, М. В. Селькін, І. Ф. Харламаў, А. В. Саннікава, А. Ф. Каморнікаў, Л. П. Трацэўскі.

У рабоце сходу прыняў удзел і выступіў член гаркома партыі, член парткома ГДУ, прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў.

У прынятай па справаздачнаму дакладу пастанове вызначаны мерапрыемствы па ўхіленню ўказаных на сходзе недахопаў у рабоце партыйнай арганізацыі.

У састаў новага партбюро факультэта выбрана 7 камуністаў. Сакратаром партбюро зноў выбран дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі **Л. Я. Палякоў.**

**А. ВАСІЛЬЕЎ,**
**член партбюро,**
**асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі.**

* * *

На гэтым тыдні адбыліся справаздачна-выбарныя партыйныя сходы на фізічным і эканамічным факультэтах.

Камуністы дэталёва абмеркавалі вынікі сваёй работы за прайшоўшы перыяд, у атмасферы дзелавітасці і партыйнай патрабавальнасці ўскрывалі недахопы, гаварылі аб нявыкарыстаных рэзервах і магчымасцях, рэалізацыя якіх дазволіць больш паспяхова вырашаць адказныя задачы, што стаяць на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва перад савецкай вышэйшай школай.

У рабоце справаздачна-выбарнага партыйнага сходу фізічнага факультэта прыняў удзел і выступіў рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, эканамічнага факультэта — намеснік сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце Я. А. Семянчук.

Выбраны новыя саставы партбюро. Іх сакратарамі выбраны: на эканамічным факультэце — А. І. Максімовіч, на фізічным — Т. П. Жалонкіна.

*Інтэрнат—твой дом*

# УКАРАНЯЦЬ УСЁ ЛЕПШАЕ

**Завяршыўся агляд-конкурс палітыка-выхаваўчай работы ў інтэрнатах універсітэта, які праводзіўся камітэтам камсамола і прафкомам студэнтаў.**

Ва універсітэце студэнт набывае трывалыя веды, каб стаць высокакваліфікаваным спецыялістам. Аднак пры арганізацыі вучэбнага працэсу мы павінны памятаць і пра яго выхаваўчы характар. Але ці дастаткова часу адводзіцца ў вучэбнай праграме для маральнага, эстэтычнага і фізічнага выхавання маладых людзей? Для гэтага неабходна праводзіць мэтанакіраваную і карпатлівую пазааўдыторную палітыка-выхаваўчую работу са студэнтамі. Правільная яе пастаноўка ў інтэрнаце з улікам яго спецыфікі з'яўляецца важнай састаўной часткай усёй ідэалагічнай работы са студэнцкай моладдзю. Што ж робіцца ў гэтым напрамку ў інтэрнатах нашага універсітэта?

Трэба адзначыць, што формы і метады палітыка-выхаваўчай работы ў іх сталі разнастайнымі і цікавымі. Тут і лекцыі, і гутаркі за «круглым сталом», сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, з інфармацыйнымі і дэпутацкімі групамі.

У кожным інтэрнаце ёсць штосьці адметнае, сваё, што заслугоўвае ўвагі іншых. Так, у інтэрнаце, дзе жывуць студэнты матэматычнага факультэта, сталі папулярнымі «Дні кафедр», дыспуты, якія рыхтуюцца на высокім узроўні. Адзін з іх — «Ці патрэбна школа ў XXI стагоддзі?» У студэнтаў гістфіла часта наладжваюцца сустрэчы з вопытнымі выкладчыкамі, педагогамі нашай ВНУ, у час якіх вядзецца зацікаўленая размова моладзі аб яе прызначэнні, сэнсе жыцця і г. д.

Як бачна, пэўны станоўчы вопыт у гэтым напрамку ёсць, але нямала і нявырашаных задач, праблем. Адна з іх — як лепш і больш мэтазгодна весці ў інтэрнатах палітыка-выхаваўчую работу, каб пазбегнуць дубліравання мерапрыемстваў, якія праводзяцца непасрэдна ва універсітэце? Патрэбна, на наш погляд, і ў далейшым пры планаванні выхаваўчай работы прытрымлівацца накопленага ў гэтай справе вопыту. Размова ідзе аб тым, што план павінен быць накіраваным на рашэнне двух-трох канкрэтных выхаваўчых задач. Гэтаму і трэба падпарадкоўваць змест плануемых у інтэрнаце мерапрыемстваў.

Асобна трэба сказаць аб нагляднай агітацыі і інфармацыі, якая аформлена ў інтэрнатах. Змест яе , на жаль, не з'яўляецца злабадзённым і актуальным. Таму дэканатам, партыйным бюро факультэтаў трэба звярнуць на гэта асаблівую ўвагу.

Не другараднай застаецца праблема вольнага часу студэнтаў. У лепшых ВНУ краіны і рэспублікі накоплены ў гэтай справе каштоўны вопыт, які нам неабходна вывучыць і па меры магчымасці выкарыстоўваць у сябе. Дні нараджэння студэнтаў, наведванне інтэрнатаў гасцямі, узаемаадносіны камендaнта і жыхароў, увага гаспадарчых работнікаў універсітэта да патрэб інтэрната — гэта таксама нашы пытанні, якія неабходна вырашаць правільна, з улікам спецыфікі інтэрната.

І яшчэ. Існуюць тыповыя правілы для ўсіх жыхароў інтэрнатаў, якія абавязкова трэба выконваць. Аднак не ўсе робяць гэта. Прывядзём такі прыклад. Там, дзе вызначан час наведвання інтэрнатаў і строга захоўваецца прапускны рэжым, не здараецца ніякіх парушэнняў. І, наадварот, там, дзе патрабавальнасць да дысцыпліны зніжана, часцей сустракаюцца розныя негатыўныя з'явы. Як бачна, не на ўсіх факультэтах праведзены сходы па растлумачэнню студэнтам тыповых правілаў пражывання ў інтэрнаце.

Па выніках агляду-конкурсу палітыка-выхаваўчай работы першае месца заняў матэматычны факультэт, другое — гістфіл, трэцяе—біяфак. Наступныя месцы занялі адпаведна эканамічны, геалагічны факультэты, факультэт фізвыхавання, будучыя фізікі.

**Н. КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў,**

**Л. СЕЧКА,**
**старшыня савета па рабоце ў інтэрнатах пры парткоме.**

*Да 80-годдзя II з'езда РСДРП*

# НАША ЛЕНІНСКАЯ ПАРТЫЯ

У самым пачатку XX стагоддзя, на зары бальшавізму, У. І. Ленін горача і страсна заявіў: «...Дайце нам арганізацыю рэвалюцыянераў—і мы перавернем Расію!» (ПЗТ, т. 6, с. 127). Тытанічнымі намаганнямі У. І. Леніна і яго саратнікаў такая арганізацыя была створана. І іменна такой арганізацыяй стала партыя бальшавікоў, партыя новага тыпу, партыя рабочага класа, партыя сацыяльнай рэвалюцыі, партыя навуковага камунізму.

Бальшавізм як цячэнне палітычнай думкі ўзнік у 1903 годзе на II з'ездзе РСДРП. У пастанове ЦК КПСС «Аб 80-годдзі Другога з'езда РСДРП» падкрэсліваецца, што стварэнне нашай партыі неаддзельна ад велізарнай тэарэтычнай і практычнай дзейнасці У. І. Леніна—геніяльнага мысліцеля, паслядоўніка і прадаўжальніка вялікай справы К. Маркса і Ф. Энгельса. Ён творча развіў іх вучэнне прымяняльна да ўмоў эпохі і пралетарскіх рэвалюцый, эпохі стварэння сацыялізму і камунізму.

Вынікі II з'езда РСДРП удыхнулі свежыя сілы ў мясцовыя партыйныя арганізацыі ўсёй Расіі, у тым ліку і Беларусі. Яны садзейнічалі іх ідэйнаму і арганізацыйнаму абнаўленню і ўмацаванню, узнялі рэвалюцыйную работу на якасна новы ўзровень.

У сацыял-дэмакратычных арганізацыях Беларусі прыхільнікі ленінскай лініі ўсё больш рашуча размяжоўваліся з меншавікамі і бундаўцамі, утваралі свае самастойныя арганізацыі на бальшавіцкай платформе. У пачатку 1904 года па ініцыятыве У. І. Леніна былі створаны Палескі і Паўночна-заходні камітэты РСДРП. Іх дзейнасць з'явілася важнай вяхой на шляху барацьбы бальшавікоў Беларусі за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі, утварэнне БССР і Кампартыі рэспублікі.

Другі з'езд РСДРП стаў паваротнай падзеяй у развіцці не толькі расійскага, але і міжнароднага рабочага руху. Савецкія людзі, кажучы словамі У. І. Леніна, маюць права ганарыцца і ганарацца тым, што на долю камуністаў Расіі выпала шчасце пачаць новую эпоху сусветнай гісторыі.

Партыі Леніна давялося ўпершыню ў гісторыі чалавецтва вырашаць самыя складаныя задачы рэвалюцыйна-вызваленчай барацьбы рабочага класа і стварэння новага грамадства. У яе шматгранным і багацейшым вопыце адлюстраваны важнейшыя заканамернасці барацьбы сіл сацыяльнага прагрэсу за мір, дэмакратыю, нацыянальнае вызваленне, сацыялізм і камунізм. Адсюль — інтэрнацыянальнае значэнне бальшавізму, яго велізарнага гістарычнага вопыту. У. І. Ленін выканаў велізарную работу, каб бальшавізм, гістарычны вопыт нашай партыі сталі здабыткам усяго сусветнага камуністычнага руху, узорам сапраўднай рэвалюцыйнай навукі, стратэгіі, тактыкі.

Выдатную ролю ў гэтым адыграла галоўная падзея XX стагоддзя — Вялікі Кастрычнік. Яго перамога, уздзеянне на іншыя краіны і народы зрабілі бальшавізм буйнейшым ідэйна-палітычным фактарам міжнароднага жыцця. Бальшавізм і яго дзецішча—Кастрычніцкая рэвалюцыя сталі ў вачах сусветнага пралетарыяту жывым, натхняючым прыкладам смелай гістарычнай ініцыятывы і рэвалюцыйнай творчасці, мужнасці і гераізму.

Логіка гісторыі і праўда жыцця пераканаўча сведчаць аб тым, што веліч і значэнне вопыту партыі Леніна ў рэвалюцыйнай барацьбе і пабудове новага свету раскрываецца ўсё больш глыбока і рэльефна з кожным новым крокам чалавецтва па шляху грамадскага прагрэсу.

Сёння, як ніколі раней, высокі аўтарытэт СССР і нашай ленінскай партыі. «Іменна партыя, — гаварыў Ю. У. Андропаў у дакладзе «Шэсцьдзесят гадоў СССР»,—была і застаецца той магутнай творчай, мабілізуючай сілай, якая забяспечвае няспынны рух наперад на ўсіх напрамках грамадскага прагрэсу. Калі мы гаворым: «Народ і партыя адзіныя!» — гэта канстатацыя таго бясспрэчнага факта, што мэты і задачы, пастаўленныя перад сабой партыяй, дакладна адлюстроўваюць спадзяванні, патрэбы ўсіх савецкіх людзей. І шматмільённы наш народ сваімі справамі ажыццяўляе палітыку партыі».

Бальшавізм узнік на трывалай базе марксізму. З таго часу партыя Леніна ўсю сваю рэвалюцыйна - пераўтваральную дзейнасць будуе на непахісным фундаменце гэтай вялікай навукі. Матэрыялы і дакументы XXV і XXVI з'ездаў КПСС глыбока пранізваюць палажэнне аб тым, што марксізм - ленінізм — гэта адзіна надзейная аснова для распрацоўкі правільнага палітычнага курса, унутранай і знешняй палітыкі. Камуністы, узброеныя тэорыяй навуковага камунізму, глыбей за ўсіх і правільней за ўсіх бачаць сутнасць і перспектыву працэсаў, якія адбываюцца ў свеце, робяць з гэтага правільныя вывады для сваёй барацьбы за інтарэсы рабочага класа, працоўных мас, за дэмакратыю, мір і сацыялізм.

